# Свята «Масленіца па-сучаснаму»

**К. С. Хадасевіч-Лісавая,**
педагог-арганізатар вышэйшай катэгорыі
Ждановіцкай СШ Мінскага раёна
**Р. Г. Чашун,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
Ждановіцкай СШ Мінскага раёна

**Вядучая.** Вас з гасціннасцю вітаем,
Запрашаем, запрашаем,
Паважаныя сябры!
На вячоркі ўсе сюды!

Добры дзень добрым людзям! Свята ў нас якое! Масленіца! Любяць гэта свята людзі. Сустракаюць, святкуюць! Вось і мы сёння весяліцца будзем. З зімой развітвацца, вясну сустракаць. А чым славіцца Масленіца? Якімі стравамі? *(Блінамі.)* Правільна, і ў нас сёння бліны будуць, ды няпростыя, незвычайныя, а спявальныя, танцавальныя, модныя, вясновыя. Паспрабуем, пакаштуем ці хаця б палюбуемся!

На стале чыгунок чарадзейны, у ім бліны адмысловыя. Кожны будзем даставаць, гаспадыню вітаць, свае таленты раскрываць. А чаго чакаць? Зараз і пачнём!

Як вы думаеце, з чаго бліны пякуць? З мукі? Вы ўпэўнены? Можа, мамы вашы і пякуць з мукі, а нашы бліны чароўныя, і я добра ведаю, што яны не з мукі. *(Дастае першы блін.)*

Пачастунак гэты ад майстрыцы-модніцы, якая бліны свае з васільковай мукі пячэ. А ўсё таму, што васількі – яе любімыя кветкі. А яшчэ і марожанае ёсць у нас з васількоў і лёну. Беларускае такое марожанае. Вы спрабавалі? Вось і мы зараз васільковае свята ў падарунак майстрыцы-модніцы зладзім, пакажам, якія дзівосныя ўпрыгожанні атрымліваюцца з гэтых кветак.

*Моднае дэфіле «Васільковая фантазія» (удзельнікі выходзяць, называюць свой выраб, дэманструюць яго).*

**Вядучая.** Цікава, што за другі блінок у нашым чарадзейным чыгунку. Якая гаспадыня яго спякла? Давайце паглядзім! *(Дастае блін.)* Гэта пані Рыфмаванка нам свой паэтычны блінок даслала. Яна, калі бліны пячэ, вершы складае. Давайце і мы з вамі паспрабуем падабраць рыфмы да слоў, якія пані Рыфмаванка нам у блін запякла.

Мука – *рука,* вясна – *сасна, красна, ясна.*

Елак, елак – гэта панядзелак.

Орак орак – зноў аўторак.

Ада, ада – заўтра серада.

Ер, ер – чысценькі чацвер.

Ятніца, ятніца – прыйдзе і пятніца.

Ота, ота – працавітая субота.

Еля, еля – любімая нядзеля.

Цудоўна! Ведаю я, што пані Рыфмаванка любіць вершы слухаць. Таму запрашаю на сцэну тых, хто сам спрабуе вершы пісаць.

*«Купалінка» чытае.*

**Вядучая.** Што гэта? Чуеце? З чыгунка чароўнага музыка льецца! Мабыць, спадарыня Нотка даслала нам свае музычныя бліны пакаштаваць. Яны ў яе заўсёды смачныя і настрой падымаюць. Вось і мы зараз для спадарыні Ноткі вясновыя мелодыі зайграем.

*Іграюць саксафон, труба, гітара, іоніка.*

**Вядучая.** Паслухайце, нехта спявае! Гэта ж з нашага чыгунка беларускія песні чуюцца! Праверым, ці правільна мы адгадалі! *(Дастае блін.)* Так і ёсць! Яго, вядома, спадарыня Песенька згатавала. У яе што ні блін – то песня! Дык і мы спяваць умеем! Зараз і пакажам!

*Дзеці спяваюць песні.*

**Вядучая.** У чыгунку нашым быццам скача нехта! Ды рытмічна так, хораша! Ці не танцы гэта? Канечне, танцы! Ведаю-ведаю, чый блінок там хаваецца. Гэта ж пані Танцавуля нас пачаставаць захацела. Дык і мы яе сваімі танцамі парадаваць можам! Гэй, танцоры! Усе сюды!

*Выконваюцца танцы.*

**Вядучая.** Як хораша на сэрцы! Як светла на душы! Мы з вамі цудоўнае свята адзначаем, мы ў лепшай краіне жывём. Пра яе вершы складаюць, песні спяваюць.

Добра мы з вамі павесяліліся!

Прыгажосцю налюбаваліся!

Свята адзначылі!

Час развітвацца, сябры.

Дзякуй вам, людзі добрыя!

За сустрэчу прыветную

Ды за гасцінцы смачныя.

Да пабачэння!